**Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ**

# Крэпасць і горад Брэст-Літоўск у час Першай сусветнай вайны паводле сведчанняў відавочцаў

*Летам 1915 года адбылося “вялікае адступленне” расійскай арміі на ўсход, якое суправаджалася значнымі людскімі і матэрыяльнымі стратамі, масавым бежанствам мірнага насельніцтва. Асабліва пацярпеў горад Брэст-Літоўск, які быў спалены адступаючымі войскамі.*

100 гадоў таму беларускі народ апынуўся перад цяжкімі выпрабаваннямі. Летам 1915 г. баявыя дзеянні Першай сусветнай вайны перакінуліся на беларускія землі. Адступленне расійскіх войскаў, масавае бежанства, усталяванне нямецкімі кайзераўскімі войскамі акупацыйнага рэжыму ў заходнебеларускім рэгіёне паклалі пачатак сістэмнага крызісу Расійскай Імперыі.

Беларускія гарады і мястэчкі панеслі велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. Прычым асабліва вылучаўся ў гэтым плане Брэст-Літоўск (менавіта так называўся тады Брэст), дзе было разбурана 80% жылёвага фонду. На жаль, драматычныя падзеі жніўня 1915 г. у крэпасці і горадзе Брэст-Літоўску не знайшлі належнага адлюстравання ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі. На іх старонках толькі адзначаецца, што пад пагрозай акружэння расійская армія пакінула Брэст і іншыя заходнебеларускія гарады[1]. Толькі ў асобных даследаваннях па гісторыі фартыфікацыі С.Пiваварчыка[2], у кнігах У. Бяшанава, А. Суворава па гісторыі Брэсцкай крэпасці[3] паказаны яе стан напярэдадні і ў час Першай сусветнай вайны. Фрагментарна звесткі пра разбурэнне горада і крэпасці закрануты таксама ў некаторых іншых навукова-папулярных выданнях[4]. Лёс крэпасці і горада Брэст-Літоўска ўкладзены ў агульную панараму тагачасных няўдач расійскай арміі, паказаную ў манаграфічнай працы М.Смальянінава "Беларусь в Первой мировой войне, 1914—1918 гг."[5]. Аднак падрабязнага асвятлення гэтай трагічнай старонкі горада з выкарыстаннем як факталагічнага матэрыялу, так і шматлікіх успамінаў відавочцаў (вайскоўцаў, цывільных асобаў), па-



***ВАБІШЧЭВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.***

*Загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, доктар гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1965 г. у в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1990 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1996 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 1990–1992 гг. працаваў настаўнікам у СШ № 21 г. Брэста. З 1992 г. працуе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна. Лаўрэат конкурса ВАК Рэспублікі Беларусь на лепшую доктарскую дысертацыю па гуманітарных навуках 2011 г. Аўтар больш за 300 публікацый, у тым ліку манаграфій “Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) (Брэст, 2004), “Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)” (Брэст, 2008). Адзін з сааўтараў калектыўных прац “Гісторыя Беларусі” (Т. 5 Мн., 2006), “Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці” (Мн., 2012), архіўнага даведніка “Polska-Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939” (Т. 1. W-wa, 2013; Т. 2. W-wa, 2014).*

куль няма. У дадзеным артыкуле аўтар паспрабуе запоўніць гэтую лакуну.

Спачатку коратка звернемся да гісторыі горада. Пасля ўзвядзення ў 1842 г. крэпасці забудова горада Брэст-Літоўск разгарнулася на тэрыторыі яго былых Кобрынскага і Валынскага прадмесцяў. Далейшае ўдасканаленне абарончых пабудоў крэпасці і чыгуначнае будаўніцтва паспрыялі хуткаму росту горада ў канцы XIX — пачатку XX ст. Напярэдадні Першай сусветнай вайны Брэст-Літоўск з'яўляўся буйным павятовым горадам Гродзенскай губерні, значным транспартным вузлом. У 1912 г. тут пражывалі 57 тыс. чалавек, з іх 39 тыс. яўрэяў. Сярод прамысловых прадпрыемстваў пераважалі дробныя (да 100 рабочых): чыгуначныя майстэрні і дэпо, 12 гільзавых заводаў (напрыклад, "Імперыял", "Сюрпрыз"), якія выраблялі папяросныя гільзы, гарбарныя заводы. Сярод шматлікіх рамесных вытворчасцяў былі майстэрні па вырабе і рамонце адзення, абутку, розных прыстасаванняў і інш. Больш буйнымі прадпрыемствамі былі тытунёвая мануфактура, чыгуналіцейны і механічны заводы. У горадзе дзейнічалі мужчынская і жаночая гімназія, гарадское, камерцыйнае, рэальнае, пачатковыя чыгуначныя і прыходскія вучылішчы, храмы розных канфесій (праваслаўныя, каталіцкія, іудзейскія). Пасля вялікіх пажараў 1895 і 1901 гг. акцэнт у горадабудаўніцтве быў зроблены на ўзвядзенне каменных пабудоў (пераважна двухпавярховых дамоў). У пачатку XX ст. у горадзе з'явіліся буйныя грамадскія пабудовы — Свята-Мікалаеўская брацкая царква, мужчынская гімназія, гандлёвы пасаж Ратнера і інш.[6]. Асабліва вылучаліся сваёй забудовай вуліцы Мільённая, Паліцэйская (сучасная Савецкая), Шасэйная (Машэрава), Дваранская (Міцкевіча).

Што тычыцца Брэст-Літоўскай крэпасці, то ў адпаведнасці з Генеральным планам яе развіцця на 1912—1921 гг. прадугледжвалася стварэнне абваднай лініі абароны. Аднак да рэалізацыі гэтага плана прыступілі толькі летам 1913 г. і да пачатку Першай сусветнай вайны выканаць пастаўленыя задачы не паспелі. Абстаноўка 1914 г. прымусіла актывізаваць будаўніцтва ўсіх фартыфікацыйных аб'ектаў. Свой уклад у рэканструкцыю крэпасці напярэдадні і ў пачатку Першай сусветнай вайны ўнеслі вядомыя ваенныя інжынеры Іван Бялінскі (5-ы форт), Дзмітрый Карбышаў (7-ы форт) і інш. Землянымі і бетоннымі работамі займалася мясцовае насельніцтва (з пачатку вайны — і ваеннапалонныя), таксама працавалі арцелі муляроў, цесляроў з цэнтральных расійскіх губерняў[7]. З-за недахопу сродкаў не ўсё ўдалося пабудаваць, але ў цэлым да кастрычніка 1914 г. работы былі скончаны, а да вясны 1915 г. абвадная лінія абароны набыла завершаны выгляд. Яна мела 13 фартоў* (11 новых, 2 перабудаваныя старыя форты), 21 умацаваны пункт, агульная працягласць складала 45 км[8]. Да жніўня 1915 г. гэтая крэпасць 1-га класа Варшаўскай вайсковай акругі лічылася самай падрыхтаванай для абароны расійскай крэпасцю.

Вялікае адступленне расійскай арміі летам 1915 г. выклікала хвалю масавага бежанства грамадзянскага насельніцтва на ўсход, г. зв. "вялікі зыход". Падзенне крэпасцяў Коўна, Асавец, Новагеоргіеўск (Модлін) паставіла пад пагрозу акружэння крэпасць у Брэст-Літоўску. Наступленне нямецкіх і аўстра-венгерскіх войскаў стрымлівала 3-я расійская армія пад камандаваннем генерала Л.Леша. Паводле загада каменданта крэпасці, генерала У.Лаймінга ад 1 жніўня 1915 г. пачалася эвакуацыя мірнага насельніцтва з Брэст-Літоўска[9]. На яе правядзенне адводзілі тры дні. Крэпасць рыхтавалася да асады. Скліканы 5 жніўня Савет абароны крэпасці, у склад якога былі ўключаны камандзіры і адказныя ваенна-інжынерныя спецыялісты на чале з камендантам У.Лаймінгам, аднадушна заявіў, што пры беражлівым выкарыстанні наяўных боепрыпасаў і харчавання, а таксама папаўненні ўзбраенняў, снарадаў асаду можна трымаць нават да 8 месяцаў[10]. Пры гэтым, аднак не ўлічвалася, што найбольш баяздольныя часці ўвесь час перакідваліся на фронт, а ў крэпасці заставаліся непадрыхтаваныя да доўгатрывалай абароны вайсковыя фарміраванні рэзервістаў, апалчэнцаў[11]. Ва ўмовах пагаршэння сітуацыі ўжо позна ўвечары 7 жніўня 1915 г. паступіў загад Вярхоўнага камандавання аб эвакуацыі гарнізона крэпасці, вывазе з яе ўзбраення, боепрыпасаў, маёмасці і іншых рэчаў, а таксама вывадзе грамадзянскага насельніцтва горада. Насуперак пазіцыі каменданта крэпасці У.Лаймінга камандаванне не праявіла імкнення выкарыстаць магчымасці доўгатрывалых фартыфікацыйных умацаванняў. Па словах генерала І.Лідэрса, які ў 1914 —1915 гг. з'яўляўся начальнікам інжынераў крэпасці Брэст-Літоўск, генерал Л.Леш (камандуючы 3-й арміяй) глядзеў на крэпасць "*не як на цвярдыню, пры апоры на якую ён мог даць перадышку сваёй арміі, а як на прыкрую абузу, ад якой усяляк хацеў, відавочна, пазбавіцца*"[12]. У складаных ваенна-стратэгічных абставінах (пагроза акружэння Брэст-Літоўска непрыяцельскімі войскамі) камандаванне прыняло рашэнне пакінуць крэпасць і адступіць. Паводле плана, распрацаванага Саветам абароны крэпасці, ужо з раніцы 8 жніўня разгарнулася праца па эвакуацыі гарнізона крэпасці.

На працягу пяці дзён пад абстрэламі непрыяцельскай артылерыі і бамбёжкамі авіяцыі людзі загружалі боепрыпасы і абсталяванне ў вагоны, якія накіроўваліся на ўсход. Аднак чыгуначнікі не змаглі забяспечыць неабходную колькасць таварнага саставу. Для інжынерных грузаў неабходна было 600 вагонаў, а выдзелілі толькі 120. Усю "рухомую" маёмасць грузілі на платформах цэнтральнага інжынернага склада, каля крапаснога рэфрыжэратара (форт "Граф Берг") і майстэрні III форта. Тое, што не змаглі пагрузіць у вагоны, псавалі або знішчалі. Нягле-

* У выданнях па гісторыі крэпасці памылкова называецца 14 фартоў, аднак запланаваны форт Н так і не быў пабудаваны.

дзячы на паніку і неразбярыху, пад кіраўніцтвам інжынера-чыгуначніка Э. Шуберскага на ўсход было эвакуявана абсталяванне шасці прадпрыемстваў і некаторая каштоўная маёмасць[13].

Дэталёвае апісанне ходу і вынікаў эвакуацыі з крэпасці прыведзена ва ўспамінах ужо згаданага генерала І.Лідэрса. Тут па днях і нават гадзінах распісана хоць і паспешная, абмежаваная па часе і экстрэмальная па абставінах, але планамерная падрыхтоўка і эвакуацыя крапасной маёмасці, знішчэнне абарончых збудаванняў, транспартных камунікацый і гарадскіх будынкаў. Ужо 12 жніўня 1915 г. крапасныя форты давялося абараняць ад непрыяцельскага наступлення. Да вечара гэтага дня з крэпасці былі выведзены апошнія абозы і часці гарнізона, акрамя тых, якія павінны былі заняцца мініраваннем і падрывам умацаванняў. Вечарам крэпасць пакінуў камендант. Ён вывез шыфры, сцяг, штандар, ганаровыя ключы. Пасля адыходу вартавой аховы і ар'ергарда 3-й арміі пачаліся падрывы заходніх і паўднёва-заходніх фортаў крэпасці, мастоў. Адразу ў некалькіх месцах горада запалалі пажары.

Пазней, 18 жніўня 1915 г., камендант У.Лаймінг адзначаў у справаздачы камандаванню, што *"ўсімі чынамі крэпасці на чале з начальнікамі крапасных упраўленняў былі зробленыя нечалавечыя намаганні для таго, каб на працягу 5 дзён вывезці з крэпасці ўсю каштоўную маёмасць, якая звозілася ў першакласную крэпасць гадамі і нават дзесяцігоддзямі".* Далей ён дадаваў: *"Толькі рускі салдат можа перaадолець усе гэтыя цяжкасці"*[14]. Пралікі каманднага саставу У.Лаймінг прызнаў непазбежнымі ў тых экстрэмальных абставінах. Ён дакладваў, што былі поўнасцю ўзарваныя абарончыя ўмацаванні 1-й і 2-й ліній на Кобрынскім і Валынскім аддзелах, а іншыя часткова разбураны. Аднак праверыць дакладнасць гэтай інфармацыі ні яму, ні яго начальству было немагчыма. У рэальнасці карціна была наступнай: у абвадной лініі з 13 фортаў поўнасцю былі ўзарваны 9, часткова разбураны адзін (форт К), уцалелі толькі тры — форты А, О, VIII (Б). Умацаванні другой (унутранай) лініі абароны і цытадэль пацярпелі нязначна[15]. З 9 фортаў былі ўзарваны толькі 2 (форты IV і IX). Трэба меркаваць, што адыходзячым войскам проста не хапіла часу, каб падарваць усе ўмацаванні.

Загады аб разбурэнні і спальванні горада выконвалі казакі і спецыяльныя каманды апалчэнцаў. Паводле меркаванняў царскага ўрада і Вярхоўнага камандавання, трэба было знішчыць усе рэсурсы, якія мог выкарыстаць вораг, а таксама паспрабаваць выклікаць у насельніцтва хвалю патрыятычных пачуццяў накшталт той, што была ў час Айчыннай вайны 1812 г. Невыпадкова, што ў Расійскай Імперыі Першую сусветную вайну нярэдка называлі "Другой Айчыннай вайной". Рускі паэт Мікалай Гумілёў пакінуў у сваіх "Запісках кавалерыста" наступныя радкі пра адступленне 1915 г.: *"Увесь канец гэтага лета для мяне звязаны з успамінамі аб полымі, што вызваляе і трыумфуе. Мы прыкрывалі агульны адыход і перад носам немцаў падпальвалі ўсё, што магло гарэць: хлеб, хлявы, пустыя вёскі, памешчыцкія сядзібы і палацы..."*[16]. Аднак чакаемых вынікаў, паводле ацэнкі расійскага ваеннага гісторыка А.Кярсноўскага, тактыка Вярхоўнага камандавання царскай арміі не дала. Да таго ж, яна вельмі сур'ёзна ўскладніла гуманітарную сітуацыю ў заходнебеларускім рэгіёне. У М.Гумілёва чытаем: *"Па дарогах Літвы і Палесся пацягнуліся бясконцымі гужамі табары сарваных з наседжаных месцаў, даведзеных да адчаю людзей. Яны загрувашчвалі і забівалі рэдкія тут дарогі, змешваліся з войскамі, дэмаралізуючы іх і ўносячы бязладдзе. Стаўка не задумалася пра тое, што пасля ўздыму ўсёй гэтай чатырохмільённай масы жанчын, дзяцей і старых, ёй трэба паклапаціцца і аб іх пражыцці. ...Ранейшая ўпартасць — "Ні кроку назад!" — неяк адразу змянілася іншай крайнасцю — адступаць куды вочы глядзяць"*[17]. З праваслаўных цэркваў здымаліся і вывозіліся званы. Загады аб разбурэнні і спальванні выконваліся, але з рознай ступенню стараннасці. Як пазней успамінаў афіцэр царскай арміі С.Тóрнаў, полк якога адступаў праз Брэст-Літоўск, пачыналася самая страшэнная і бессэнсоўная старонка вайны. "*Узяўшы з сабой самыя неабходныя рэчы, ні ў чым невінаватыя мірныя жыхары ўцякалі, не аглядаючыся назад. Іх абозы нярэдка траплялі паміж нашымі і германскімі лініямі, і тады гэтым няшчасным даводзілася ў давяршэнне да ўсіх бедаў паспытаць на сабе стральбу артылерыі*"[18].

Рушыць на ўсход, пакінуўшы жыллё і маёмасць, прымушалі не толькі праваслаўнае, але і іўдзейскае насельніцтва. Ва ўсіх успамінах відавочцаў (як цывільных асобаў, так і вайскоўцаў) адзначаецца распаўсюджванне атмасферы адчаю, бездапаможнасці, безнадзейнасці і нават анархіі. "*Эвакуіруюць Брэст-Літоўск. ...Пры адступленні зрываецца з месцаў мірнае насельніцтва і гоніцца ў сярэдзіну краіны. Адусюль, з Захаду на Усход, ідзе прымусовая эвакуацыя яўрэйскага насельніцтва, якое западозрылі ў масавым шпіянажы на карысць немцаў. Усе гэтыя рускія і яўрэйскія бежанцы, як саранча, рухаюцца на ўсход, несучы з сабой паніку, гора, галечу і хваробы. ... Новая ўлада не паспявае арганізоўвацца, усюды беспарадак, хаос. Імя генерала Янушкевіча* (начальнік штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Рускай арміі вялікага князя Мікалая Мікалаевіча (Раманава). — **А.В.**) *на вуснах ва ўсіх, усе яго лаюць — і цывільныя, і вайскоўцы, а яўрэйскае насельніцтва яго проста праклінае*", — адзначаў генерал А.Спірыдовіч[19].

Вывезці ўсіх жадаючых па чыгунцы было немагчыма, паколькі цягнікоў не хапала. Відавочца тых падзей, рабочы Б.Гельфман успамінаў, што большая частка мірных жыхароў Брэст-Літоўска эвакуявалася пешшу, некаторыя — на конных фурманках. У людзей не было вады, ежы, па дарозе яны харчаваліся ягадамі, грыбамі, пладамі дзікіх яблынь, груш. Хутка распаўсюджваліся халера, сыпны тыф, дызентэрыя і іншыя заразныя хваробы. Частымі былі смерці ад абстрэлаў нямецкай артылерыі, налётаў авіяцыі[20].

Вось як запомніў падзеі тых драматычных жнівеньскіх дзён 1915 г. малалетні ўраджэнец Брэст-Літоўска Абрам Вольпін, хлопчык з сям'і яўрэйскага рамесніка-шаўца: "*Нямецкая авіяцыя інтэнсіўна бамбіла крэпасць і некаторыя бомбы траплялі ў цэль. Адбываліся выбухі велізарнай сілы, было шмат ахвяр, а ў большасці дамоў, што былі бліжэй да крэпасці і ў цэнтры горада, былі выбіты ваконныя шыбы. Пачалася паніка, жыхары горада ўцякалі на ўскраіну. ...Калі паніка ўляглася, мы вярнуліся дамоў. ...На станцыю Брэст падалі эшэлоны з таварных вагонаў і было прадпісана ўсім жыхарам пакінуць горад. Да кожнага двара, да дамоў падыходзілі казакі і прыспешвалі. Мой бацька дзесьці дастаў фурманку, пагрузіў пасцельныя рэчы (пярыны, падушкі) і іншы хатні скарб, пасадзіў нас, дзяцей, дзеда нашага, маму, і мы рушылі да вакзала*"[21].

Ваенны ўрач Леў Вайталоўскі быў непасрэдным сведкам эвакуацыі з Брэст-Літоўска войскаў і насельніцтва, якое папоўніла абяздоленую армію бежанцаў: "*Ідзе хаатычнае бегства. Без канца цягнуцца абозы, транспарты, шпіталі, палкі казакаў, кулямётныя роты, паркі і зноў шпіталі, абозы, транспарты і этапныя батальёны. Па ўсіх напрамках гудуць дзясяткі аэрапланаў. Не паспеюць дазорныя пушкі павярнуцца ў адзін бок, як у трох іншых месцах ужо зноў уюцца германскія "альбатросы"* і "таубэ"**. Чуваць кароткія грукаты разрываў. Бомбы ірвуцца зусім блізка. Неба ўсеяна белымі бавоўнянымі воблачкамі, якія павольна растаюць у вышыні і замяняюцца дзясяткамі новых. Паветра нечакана напаўняецца дзіўным працяглым гулам, што трасе, ад якога доўга пагойдваюцца дрэвы. Праз пятнаццаць хвілін ужо перадаецца з вуснаў у вусны, што гэта бомба ўзарвала бак з бензінам на станцыі Брэст-Таварны і пакінула на пуцях дзясяткі знявечаных трупаў. Людзі тэрарызаваныя паветранымі драпежнікамі і як зачараваныя не зводзяць з іх вачэй. Не даехаўшы да станцыі Жабінка, цягнік з Брэста паспытаў на сабе налёт паветранай флатыліі. Спалоханы машыніст спыніў цягнік пасярод поля і людзі кінуліся ўрассыпную, хто куды*"[22].

Жыхары горада вымушаны былі пакідаць нажытыя гадамі маёмасць і жыллё. "*Поўнасцю абстаўленыя кватэры, з бялізнай і нават з насільным адзеннем. Крамы, перапоўненыя таварамі, — усё было кінута няшчаснымі жыхарамі і гандлярамі. Брэст-Літоўск адразу змяніў свой твар: змоўк, заснуў і толькі вайсковыя мундзіры і форменная вопратка сёстраў міласэрнасці час ад часу з'яўляліся на вуліцах*"[22]. Аўтар прыведзеных радкоў, відавочца тых падзей Баляслаў Веверн (камандзір дывізіёна, які адступаў праз горад) быў моцна ўражаны гэтай трагедыяй: "*Мы ідзём прама да мора агню, якое бушуе: гарыць горад Брэст-Літоўск. Страшэннае, жудаснае зарава каласальнага пажару! Злавеснае відовішча!... Гэта пекла! Горача. Мы лезем прама ў гіганцкі касцёр: мы выходзім на галоўную вуліцу горада Брэст-Літоўска. Дзве каласальныя сцяны суцэльнага агню, які бушуе, уецца з трэскам, з шыпеннем, з нейкім стогнам. Бура агню! ... Вогненная стыхія, якая бушуе. Які жах і, разам з тым, якая веліч і якая прыгажосць! Гэта нашы палкі, што адступаюць, падпалілі Брэст-Літоўск*"[24].

Ужо згаданы ваенны ўрач Л. Вайталоўскі таксама пакінуў апісанне горада 12 жніўня 1915 г. "*Ідзём з апошнімі рэшткамі арміі, якая ашалела бяжыць. З цяжкасцю прадзіраемся праз полымя, якое бушуе. Вогненныя языкі шугаюць жарам у твар. Скінуўшы вершнікаў, дзясяткі коней у адзічэлым вар'яцтве з тупатам нясуцца па палаючых вуліцах Брэста. На станцыі цягнікі ўцякаюць, не дачакаўшыся пасажыраў. Адзінокія салдаты, якія адбіліся, сёстры міласэрнасці, бежанцы — кідаюцца ў першы вагон, які трапляецца, і бягуць, невядома куды і для чаго. ... З высокага прыгорка ў апошні раз адкрываецца палаючы Брэст. У вячэрнім небе скача і гойсае шырокае вогненнае зарава. Імглістае паветра, напоўненае крыкамі і гарам, гудзе і ўздрыгвае ад выбухаў: гэта з грукатам узлятаюць апошнія форты*"[25]. А вось якім запомнілася адступленне з горада аднаму з малодшых афіцэраў-артылерыстаў — штабс-капітану Стэфаноўскаму: "*Пакідалі Брэст-Літоўск у цемры, сярод пажараў і выбухаў, якімі знішчаліся вялізныя склады нявывезеных інтэнданцкіх запасаў, а таксама і форты*"[26].

Генерал І. Лідэрс, які ўвечары 12 жніўня знаходзіўся разам з падпалкоўнікам М.Міштаўтам у прыгараднай вёсцы Трышын (адкуль фіксаваў ход падрыву фортаў і крапасных умацаванняў), назіраў за палаючым горадам. Пазней ён пісаў: "*Мы былі сведкамі незабыўнай карціны феерычнага пажару, якая скаланула душу: гарэлі не толькі цалкам увесь горад, яго ваколіцы, пабудовы інжынернай майстэрні на форце III, але і навакольныя вёскі на ўсёй прасторы, даступнай воку, і нават асобныя крыжы, што тырчэлі на могілках, былі ахоплены полымем і гарэлі як факелы. Грукат здзейсненых выбухаў фортаў і стралянiна непрыяцельскай артылерыі снарадамі, што свяціліся, і ракетамі па чыгуначным вузле дапаўнялі феерыю*"[27]. У поўным знішчэнні прыватнай і грамадзянскай гарадской маёмасці ён бачыў вынік свавольства, самаўпраўства тылавых часцей 3-й расійскай арміі і дзейнасці спецыяльных падпальшчыкаў, якія замыкалі армейскі ар'ергард.

Драматычную карціну адступлення расійскай арміі з палаючага Брэст-Літоўска адлюстраваў у сваім аўтабіяграфічным рамане "Цяжкі дывізіён" пісьменнік Аляксандр Лебядзенка. "*Усходняя частка горада была ўжо ўся ў агні. Вялікія і малыя дамы, якія выстраіліся ў лінію па абодвух баках шашы, гарэлі полымем, якое бурна разварочвалася ветрам. Шасэйная дарога каменным хрыбтом уваходзіла ў дымы пажараў, і спераду па ўсёй яе працягласці бушавала по-*

---

* Самалёт-знішчальнік "Albatros D" германскіх ваенна-паветраных сілаў. Адносна яго Л.Вайталоўскі памыліўся, бо гэтая серыя самалётаў пачала выкарыстоўвацца з вясны 1916 г.

** Мнагамэтавы самалёт "Taube", які быў на ўзбраенні ваенна-паветраных сілаў Германіі да 1916 г.

*лымя. Парывы ветру шпурлялі хвасты дыму, пунсовыя абрыўкі полымя на самую сярэдзіну шашы. Коні ішлі неспакойна. Упарта спыняліся, вадзілі вачыма, хрыпелі, адходзілі назад і ўсюды ірваліся наперад, сустракаючы метлы дыму, якія пырскалі іскрамі. Пешыя ішлі пасярэдзіне шашы. Ззаду раўло і месцамі ўжо супакойвалася бязлюднае пажарышча, што дымілася, якое пакарыла горад. Агонь спраўляў небывалы трыумф. Ніхто не змагаўся з полымем. ...Птушкі, выгнаныя бедствам, насіліся кругом з цягучымі, безнадзейнымі крыкамі. Вокны адказвалі тонкім трэскам шыбаў, якія лопаліся. Самі сабой пачыналі іграць інструменты ў кінутых дамах. Над адзінокай царквой гудзеў звон. Нейкі стары-званар, які памятаў лепшыя часы і ніколі не бачыў такога вогненнага разгулу, не зыходзіў са званніцы, можа таму, што ўвесь невядомы, нябачаны свет здаваўся яму больш чужым, чым гэта пажарышча, кінутае ўсімі, нават птушкамі, акрамя яго аднаго...*"[28].

Эвакуацыя, пажары ў Брэст-Літоўску, калоны бежанцаў на гасцінцах у наваколлі зафіксаваныя на фотаздымках адступаючых расійскіх вайскоўцаў, у прыватнасці ваеннага ўрача 206-га Сальянскага пяхотнага палка Стэфана Хубіцкага[29].

Нават нямецкія салдаты былі ўражаныя страшэннымі разбурэннямі крэпасці і горада. Прывядзём сведчанне аднаго з нямецкіх штабных афіцэраў. "*Калі мы пад’язджалі да Брэст-Літоўска, то велізарныя слупы дыму, якія ўздымаліся да неба, падказалі тое, што мы там убачым. Але рэчаіснасць пераўзышла нашы змрочныя чаканні. ...Нас абкружала мора агню, чаду і дыму, якое зацямняла дарогу так, што нічога не было відаць у некалькіх кроках. З вачэй цяклі слёзы. Усё кола казармаў ..., каменданцкі дом, з балкона якога наш кайзер калісьці вітаў свой рускі полк* (прускі прынц, будучы германскі імператар і кароль Прусіі Вільгельм II, па запрашэнні расійскага імператара Аляксандра III наведваў крэпасць у Брэст-Літоўску 29 жніўня 1886 г.; Вільгельм II з’яўляўся шэфам *(ганаровым камандзірам) асобных расійскіх вайсковых фарміраванняў. —* **А.В.***), усё гарэла яркім полымем. Цяжка было дыхаць ад гарачыні. Тут і там ляжалі кучы снарадаў, і да іх падступаў агонь. Людзі былі занятыя выратаваннем харчавання са складоў, якія гарэлі, так што не хапала чалавечых сіл, каб патушыць такі пажар. ... Мы выйшлі з цытадэлі і накіраваліся ў горад. І тут масты цераз Мухавец аказаліся разбуранымі. ... Як укапаныя, спыніліся мы, гледзячы на гэтае гіганцкае відовішча. Наколькі магло ахапіць вока, мы бачылі суцэльнае мора агню, што ўздымаўся ў неба, над якім узвышалася, зацямняючы сонца, велізарная дымавая хмара, абвяшчаючы ўсяму наваколлю: "Брэст загінуў!*"[30]. Пазней нямецкі бок нават выпусціў спецыяльныя паштоўкі з відамі разбуранага горада для правядзення антырасійскай прапаганды.

Здача Брэст-Літоўскай крэпасці ў час "вялікага адступлення" ў жніўні 1915 г. глыбока ўстрывожыла патрыятычна настроеную частку грамадства Расійскай Імперыі. Пісьменнік А.Лебядзенка ўдала адлюстраваў гэта на прыкладзе перажыванняў галоўнага героя свайго рамана "Цяжкі дывізіён" Андрэя Кастрова: "*Брэст паўстаў на шляхах Андрэя як нейкі вынік. На што спадзявацца пасля Брэста? Нельга было ставіцца да гэтай крэпасці спакойна. Перш за ўсё трэба было адказаць самому сабе: ці можна яшчэ перамагчы? Хто вінаваты ў паражэннях? Толькі не рускі салдат, не рускі баявы афіцэр. Тады хто ж? Хто? Ці не хвалююць зараз гэтыя пытанні за малым выключэннем усю рускую інтэлігенцыю, якая носіць афіцэрскія і салдацкія пагоны і, як Андрэй, ужо губляе глебу пад нагамі? ... Брэст прымушаў думаць. Настойліва думаць. Сваімі нечаканымі, невыпадковымі якасцямі, сваім становішчам на рубяжы Царства Польскага, на мяжы Расіі. Брэст быў тлустай кропкай у яшчэ не скончаным апавяданні пра гэтую небывалую вайну*"[31]. Тут трэба дадаць, што пасля падзення недабудаванай крэпасці ў Гродне адступленне расійскай арміі яшчэ некаторы час працягвалася, пакуль у пачатку кастрычніка 1915 г. не адбылася стабілізацыя фронту па лініі Дзвінск—Паставы—Смаргонь— Баранавічы—Пінск.

13 жніўня 1915 г. нямецкія і аўстра-венгерскія войскі занялі крэпасць і горад Брэст-Літоўск. Нямецкі друк паведамляў аб "пераможным" завяршэнні штурму крэпасці, якую лічылі самай моцнай з расійскіх крэпасцяў[32]. Горад трапіў пад нямецкую акупацыю, якая доўжылася тры з паловай гады — да 9 лютага 1919 г., калі пасля выезду нямецкіх часцей Брэст-Літоўскі занялі польскія войскі. Акупанты рабавалі маёмасць, пакінутую жыхарамі і рознымі ўстановамі, вывозілі яе ў Прусію. Ва ўмовах недахопу будаўнічых матэрыялаў выбіралі з руін цэглу і разбіралі ўцалелыя дамы. Атрыманыя матэрыялы таксама вывозілі ў іншыя мясцовасці (нават у Прусію), масцілі прыгарадныя дарогі (напрыклад, да вёсак Скокі і Клейнікі — для лепшай транспартнай камунікацыі паміж штабам ў крэпасці і кватэрай камандуючага фронтам)[33]. Разбураныя гандлёвыя рады акупанты выкарыстоўвалі ў якасці лагера для ваеннапалонных. Як сведчыць згаданая справаздача каменданта крэпасці У.Лаймінга і матэрыялы польскіх органаў гарадскога самакіравання, асноўная частка жылога фонду была знішчана пры адступленні расійскімі войскамі яшчэ ў жніўні 1915 г.: з 3670 будынкаў — 2500, з 1700 хатаў — 1500[34]. Былі разбураны амаль усе прамысловыя прадпрыемствы горада. Брэст-Літоўск абязлюдзеў, стаў горадам-прывідам. У ім размяшчаліся тылавыя склады кайзераўскіх войскаў. У пачатку нямецкай акупацыі там заставалася ўсяго некалькі дзесяткаў жыхароў. Паводле звестак Брэсцкага магістрата на ўсход у бежанства падаліся каля 65 тыс. чалавек[35]. Толькі ў верасні 1915 г. пачалі паступова вяртацца жыхары, што ўхіліліся ад бежанства ці перабраліся назад цераз лінію фронту. У кастрычніку 1915 г. большасць мясцовага насельніцтва была выселена ў рэзервацыі.

Бязлюдны горад быў бяспечным для акупацыйных уладаў, што пацвярджае і прызнанне нямецкага генерала і дыпламата Макса Гофмана (з 1917 г. — начальніка штаба Галоўнакамандуючага Усходнім

фронтам): "*Усе гэтыя рускія разбурэнні былі нам на-руку, калі не лічыць жыллёвых нязручнасцяў. Возьмем для прыкладу спальванне Брэст-Літоўска, у якім нашаму штабу пазней давялося пражыць амаль два гады. Нягледзячы на спальванне, мы змаглі там уладкавацца, пры гэтым нам не трэба было клапаціцца аб пракармленні выгнаных адтуль 80 тыс. жыхароў. Таксама і адносна шпіянажу і іншых небяспек для нас было зручным тое, што рускія ачысцілі горад*"[36].

Каля ацалелых даваенных будынкаў былі ўзведзены новыя баракі (для салдатаў), вышкі. Для ваенных мэтаў акупанты пабудавалі невялікую электрастанцыю. Таксама была адрамантавана частка будынкаў у крэпасці, сярод якіх — Белы палац. "*Горад быў зусім выпалены і кватэр там не было для размяшчэння ў ім усяго штаба камандуючага Усходнім фронтам. Па сутнасці, ацалелі толькі афіцэрскія кватэры ў цытадэлі Брэст-Літоўска. ...Жылая плошча магла змясціць толькі чыста ваенную частку штаба,*" — пісаў М.Гофман[37]. Камандуючы жа Усходнім фронтам, генерал-фельдмаршал Л.Баварскі размяшчаўся ў верасні 1916 г. — маі 1918 г. ва ўцалелым сядзібным палацы Нямцэвічаў у Скоках (наваколле Брэста), пакінутым гаспадарамі, якія падаліся ў бежанства. Да верасня 1916 г. яго штаб-кватэра знаходзілася ў Слоніме. Менавіта ў палацы ў Скоках 15 снежня 1917 г. было падпісана перамір'е паміж Германіяй, яе саюзнікамі і Савецкай Расіяй. Праўда, у дакументах Скокі не ўзгадваліся, каб не рассакрэціць месца знаходжання кватэры камандуючага фронтам[38].

Праз тыдзень пасля заключэння перамір'я на тэрыторыі крэпасці — у Белым палацы — пачаліся перамовы аб заключэнні мірнага дагавора. Леў Троцкі, які прыязджаў на гэтыя перамовы, адзначаў, што "*за выключэннем некалькіх будынкаў, якія стаялі збоку ад старога горада і былі занятыя нямецкім штабам, Брэст-Літоўска, уласна кажучы, не існавала болей...*"[39]. Перамовы праходзілі няпроста, з перапынкамі, і толькі 3 сакавіка 1918 г. скончыліся заключэннем Брэсцкага мірнага дагавора, які для Савецкай Расіі быў рабаўніцкім, але адкрываў новыя магчымасці па выхаду краіны з міжнароднай ізаляцыі[40].

Што тычыцца жыцця простых жыхароў горада ў час нямецкай акупацыі, то ўмовы яго былі вельмі складаныя. Не хапала харчавання, паўсядзённых тавараў, паліва. Квітнеў "чорны рынак", на якім задорага прадавалі прадукты. Бальніцы не працавалі, частымі сталі эпідэміі інфекцыйных хваробаў.

Жыхары ў асноўным засталіся ў прадмесцях горада — на Кіеўцы і Граеўцы. Яны выжывалі за кошт агародаў, асабістых падвор'яў. Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. паскорылі працэс вяртання людзей з бежанства. Да канца 1918 г. у Брэст-Літоўску пражывала да 7 тыс. чалавек, да канца 1919 г. — 14 тыс. чалавек, а ў 1921 г. — да 30 тыс. чалавек. Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. з'явіліся прававыя падставы для вяртання бежанцаў на радзіму. Асноўная іх маса вярнулася ў горад у 1921 — 1923 гг., ужо падчас знаходжання яго ў складзе Польскай дзяржавы.

Аднаўленне горада расцягнулася на ўвесь міжваенны перыяд. Адчуваліся матэрыяльныя, фінансавыя цяжкасці. Як паведамляў Брэсцкі магістрат у Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы ў сакавіку 1925 г., горад *"з вялікай цяжкасцю і вельмі павольна выбіраецца з галечы, выкліканай вайной"*[41]. Да канца 1927 г. было адноўлена толькі 730 дамоў. Паводле інфармацыі 1928 г. брэсцкага павятовага ўрача Б.Рамецкага, у горадзе адчуваўся значны недахоп жылля. Рабочым даводзілася жыць у антысанітарных умовах, шэраг сем'яў пражываў у падвалах разбураных дамоў, а для бяздомных былі ўзведзены часовыя баракі ў прадмесці Граеўка[42]. Аднак дзякуючы мабілізацыі намаганняў мясцовага самакіравання і людзей горад паступова аднаўляўся. Да 1939 г. была дасягнута даваенная колькасць насельніцтва — каля 58 тыс. чалавек[43]. Акрамя аднапавярховых драўляных дамоў, якія будаваліся пераважна на Кіеўцы і Граеўцы, у цэнтральнай частцы горада ўзводзіліся каменныя асабнякі, будынкі Польскага банка, ваяводскага ўпраўлення і інш.[44]. А ў крэпасці размясціліся польскія вайсковыя часці правінцыйнага тылавога гарнізона.

Падводзячы высновы, трэба заўважыць, што неспрыяльная для расійскіх войскаў ваенна-стратэгічная сітуацыя ў жніўні 1915 г. прымусіла іх пакінуць крэпасць у Брэст-Літоўску, якая мела дастаткова моцныя фартыфікацыйныя ўмацаванні, але з-за адсутнасці падрыхтаванага гарнізона і абмежаванасці неабходных рэсурсаў не магла вытрымаць працяглую асаду. Размешчаны побач горад Брэст-Літоўск стаў заложнікам збегу неспрыяльных акалічнасцяў і пралікаў, спазнаў разбурэнні і пажары. Устаноўлены ў амаль абязлюдзеўшым горадзе нямецкі акупацыйны рэжым меў рабаўніцкі характар. Нягледзячы на высокую ступень эмацыянальна-псіхалагічнай экспрэсіўнасці, сведчанні відавочцаў разам з разнастайнымі архіўнымі і іншымі звесткамі даюць магчымасць даволі поўна адлюстраваць ход эвакуацыі і адступлення, маштабы разбурэнняў Брэста, а таксама намаганні грамадскіх структур і жыхароў па аднаўленні ў 1920 —1930-я гг. гэтага аднаго са старажытных гарадоў Беларусі.

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мн., 1994. С. 443; Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1 / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. Мн., 1998. С. 370; Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII — пачатак XX ст.) / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. Мн., 2005. С. 439, 443.

[2] Пивоварчик С.А. Белорусские земли в составе фортификационного строительства Российской империи и СССР (1772 —1941). Гродно, 2006; Пивоварчик С.А. Формирование и развитие системы фортификационного строительства в Беларуси (1772 —1941 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02 / БДУ. Мн., 2009.

[3] Бешанов В.В. Брестская крепость. Мн., 2005; Бешанов В. Брестская крепость. М., 2010; Суворов А. Брестская крепость. Война и мир. Брест, 2010.

[4] Бондаренко В.В. Утерянные победы Российской империи. Мн., 2010. С. 49 —51; Шарков А.В., Грозов В.В., Беставицкий Ю.А. Крест Отечества. События и лица Первой мировой войны. Мн., 2014. С. 88 —91.

[5] Смольянинов М.М. Беларусь в Первой мировой войне, 1914 —1918 гг. Мн., 2014.

[6] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэста: у 2 кн. Кн. 1. Мн., 1997. С. 170 —173, 184 —193.

[7] Лидерс И.А. Описание крепости Брест-Литовск, её мобилизации в 1914 г. и эвакуации в 1915 г. // Дзяржаўная ўстанова "Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой". НВ-9231. Арк. 15 —19.

[8] Вместе с Д.М. Карбышевым (Воспоминания русского офицера В.М. Догадина) // Отечественные архивы. 2002, № 2 // http://www.rusarchives.ru/publication/karb1.shtml; Суворов А. Брестская крепость. Война и мир. Брест, 2010. С. 42.

[9] Бешанов В. Брестская крепость. М., 2010. С. 100.

[10] Там жа. С. 94.

[11] Лидерс И.А. Описание крепости Брест-Литовск, её мобилизации в 1914 г. и эвакуации в 1915 г. Арк. 23 —28.

[12] Там жа. Арк. 45.

[13] Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII — пачатак XX ст.) / рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. С. 443.

[14] Суворов А. Брестская крепость. Война и мир. С. 49; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэста. С. 219.

[15] Суворов А. Брестская крепость. Война и мир. С. 48—51.

[16] Гумилев Н.С. Записки кавалериста // https://ru.wikisource. org/wiki/Записки_кавалериста_(Гумилёв)/Глава_XIV.

[17] Керсновский А.Ф. История Русской армии // http://militera.lib.ru/h/kersnovsky1/15.html.

[18] Торнау С.А. С родным полком (1914 —1917 гг.). Берлин, 1923. С. 74 // http://dc.lib.unc.edu/cdm/item/collection/rbr/?id=17172.

[19] Спиридович А.И. Великая война и Февральская революция 1914 —1917 гг. Нью-Йорк, 1960 —1962 // http://militera.lib.ru/memo/russian/spiridovich_ai/01.html.

[20] Историческое наследие Брестской крепости в исследованиях и экспозициях мемориала; редкол.: Г.Г.Бысюк [и др.]. Брест, 2013. С. 95.

[21] Вольпин А. Мемуары простого человека // http://mishpoha.org/library/05/0502.php.

[22] Войтоловский Л.Н. По следам войны. Походные записки. М., 1931 // http://militera.lib.ru/memo/russian/voitolovsky_ln/06.html.

[23] Веверн Б.В. 6-я батарея. 1914 —1917 гг. Повесть о времени великого служения Родине: в 2-х т. Т. 2. Париж, 1938. С. 108.

[24] Там жа. С. 113 —114.

[25] Войтоловский Л.Н. По следам войны. Походные записки // http://militera.lib.ru/memo/russian/voitolovsky_ln/06.html.

[26] Стефановский. Великий поход // Военная быль. 1974, № 128. С. 2 —8 // http://lepassemilitaire.ru/velikij-poxod-sht-kap-stefanovskij/.

[27] Лидерс И.А. Описание крепости Брест-Литовск, её мобилизации в 1914 г. и эвакуации в 1915 г. Арк. 77 —79.

[28] Лебеденко А.Г. Тяжёлый дивизион // http://www.rulit.net/books/tyazhelyj-divizion-read-226961-41.html.

[29] Biblioteka Narodowa. Sygnatura AFF. II-123 // http://polona.pl/item/5648381.

[30] Пэльман К. Бои на реке Зап. Буге летом 1915 года. Петроград, 1921. С. 45-46.

[31] Лебеденко А.Г. Тяжёлый дивизион // http://www.rulit.net/books/tyazhelyj-divizion-read-226961-39.html.

[32] Frankfurter Zeitung. 1915, 26 august // http://www.stahlgewitter.com/15_08_26.htm/.

[33] Сообщение Брестского магистрата Брестскому поветовому старосту о состоянии городского хозяйства и положении населения в годы Первой мировой войны (не ранее 12.11.1919 г.) // Брест в 1919 —1939 гг.: документы и материалы / сост. А.Г. Карапузова [и др.]. Брест, 2009. С. 75; Ващукувна-Каменецка Д. Брест — город незабываемый. Брест, 2000. С. 90.

[34] Из отчета о деятельности органов самоуправления г. Бреста за период с 1919 по 1938 г. (не ранее 1.01.1939 г.) // Брест в 1919 —1939 гг.: документы и материалы. С. 55; Бешанов В. Брестская крепость. М., 2010. С. 103.

[35] Сообщение Брестского магистрата Брестскому поветовому старосту о состоянии городского хозяйства и положении населения в годы Первой мировой войны (не ранее 12.11.1919 г.) // Брест в 1919 —1939 гг.: документы и материалы. С. 75.

[36] Гофман М. Война упущенных возможностей / пер. с нем.; предисловие В.Гурко-Кряжина. М.-Л., 1925. С. 90—91 // http://grwar.ru/library/Gofman-LostWar/.

[37] Там жа. С. 119.

[38] Гладышчук А.А. Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі: гісторыка-дакументальны нарыс. Мн., 2009. С. 173.

[39] Троцкий Л. Моя жизнь. Опыт автобиографии // http://www.magister.msk.ru/library/trotsky/trotl026.htm#st31.

[40] Брестский мир: 95 лет со дня подписания: библиографический указатель / сост.: Е.И.Жук, М.Н.Путилина; под общ. ред. А.Н.Вабищевича. Брест, 2013. С. 6.

[41] Ходатайство Брестского магистрата в Министерство внутренних дел Польши о предоставлении кредитов на восстановление города (16.03.1925 г.) // Брест в 1919 —1939 гг.: документы и материалы. С. 81.

[42] Там жа. С. 153.

[43] Там жа. С. 69.

[44] Ващукувна-Каменецка Д. Брест — город незабываемый. С. 130.